УДК 373.3.015.3

# ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСНОВЫ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Казакевіч Аксана Аляксандраўна**
настаўнік пачатковых класаў ДУА “Брожская сярэдняя школа Бабруйскага раёна”; п. Брожа, Рэспубліка Беларусь

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца псіхалагічныя асаблівасці развіцця малодшых школьнікаў і абумоўленыя імі спосабы ўзаемадзеяння настаўніка і вучня пачатковых класаў.

Аб праблемах адукацыі, выхавання і развіцця дзяцей малодшага школьнага ўзросту шмат разважаюць і пішуць. Аналіз псіхолага-педагагічнай перыёдыкі дазваляе сцвярджаць, што гэта пытанне знаходзіцца пад пільнай увагай вучоных, настаўнікаў і бацькоўскай супольнасці.

Пачатковая школа з’яўляецца неадрыўнай часткай усёй сістэмы адукацыі. Педагог пачатковай школы вучыць дзяцей творчасці, выхоўвае ў кожным дзіцяці самастойную асобу, якая валодае інструментамі самаразвіцця і самаўдасканалення, якая можа знаходзіць эфектыўныя



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

спосабы рашэння праблемы, ажыццяўляць пошук патрэбнай інфармацыі, крытычна думаць, дыскутаваць, камунікаваць.

Малодшы школьны ўзрост – гэта ўзрост 6–11-гадовых дзяцей, якія навучаюцца ў 1–4-х класах школы. Межы ўзросту і яго псіхалагічныя характарыстыкі вызначаюцца сістэмай адукацыі, якая прынята на дадзены адрэзак часу, тэорыяй псіхічнага развіцця, псіхалагічнай узроставай перыядызацыяй.

З прыходам дзіцяці ў школу ўсталёўваецца новая сацыяльная сітуацыя развіцця, цэнтрам якой становіцца настаўнік. Пачатак школьнага навучання азначае пераход ад гульнявой дзейнасці да вядучай дзейнасці малодшага школьнага ўзросту – вучэбнай, у якой фарміруюцца асноўныя псіхічныя новаўтварэнні. Вучэбная дзейнасць – асаблівая форма актыўнасці вучня, накіраваная на змены самога сябе як суб'екта навучання.

У малодшым школьным узросце завяршаецца пераход ад нагляднa-вобразнага да славесна-лагічнага мыслення. Школьная адукацыя будуецца такім чынам, што славесна-лагічнае мысленне атрымлівае пераважнае развіццё. Калі ў першыя два гады навучання дзеці шмат працуюць з нагляднымі вобразамі, то ў наступных класах аб'ём такіх заняткаў скарачаецца. Вобразнае мысленне ўсё менш і менш становіцца неабходным у вучэбнай дзейнасці.

Дзеці, якія заканчваюць пачатковую школу, істотна адрозніваюцца ад тых, якія прыйшлі ў першы клас. Патрабаванні вучэбнай дзейнасці непазбежна вядуць вучняў да фарміравання адвольнасці як характарыстыкі ўсіх псіхічных працэсаў. Адвольнасць фарміруецца ў выніку таго, што дзіця штодня выконвае тое, што патрабуе яго пазіцыя вучня: слухае тлумачэнні, рашае задачы і г. д. Паступова яно вучыцца рабіць тое, што трэба, а не тое, што яму хочацца. Такім чынам вучні вучацца кіраваць сваімі паводзінамі, пераадольваць цяжкасці, рухацца да пастаўленай мэты, шукаць аптымальныя шляхі яе дасягнення.

Таксама вучні аваладваюць рэфлексіяй. Настаўнік патрабуе ад вучня не толькі рашэння задачы, але і абгрунтавання яго правільнасці. Гэта паступова фарміруе здольнасць у вучня ўсвядоміць, што ён робіць і што зрабіў, а таксама ацаніць, ці правільна ён зрабіў і чаму ён лічыць, што правільна. Такім чынам, вучань паступова вучыцца глядзець на сябе быццам вачамі іншага чалавека і ацэньваць сваю дзейнасць.

У пачатковы перыяд навучання вучням першага класа патрабуецца апора на знешнія прадметы, схемы, малюнкі. Паступова яны вучацца замяняць прадметы словамі, утрымліваць у галаве вобразы прадметаў.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Да заканчэння пачатковай школы вучні ўжо могуць у разумовым плане выконваць дзеянні сам сабе. Гэта значыць, што іх разумовае развіццё ўзнялася на новую прыступку, у іх сфарміраваўся ўнутраны план дзеянняў [1].

У малодшым школьным узросце праяўляюцца індывідуальныя адрозненні паміж дзецьмі. Фактычна ў класе немагчыма знайсці двух цалкам аднолькавых вучняў. Псіхолагі вылучаюць "тэарэтыкаў", якія з лёгкасцю рашаюць вучэбныя задачы ў славесным плане, "практыкаў", якім патрабуецца апора на нагляднасць і практычныя дзеянні, і "мастакоў" з яркім вобразным мысленнем.

Індывідуальныя адрозненні датычацца і пазнавальнай сферы: адны маюць зрокавы тып памяці, другія – слыхавы, трэція – зрокава-рухальны і г. д. [2]. Таму памяць у малодшым школьным узросце трэба развіваць у напрамках адвольнасці і асэнсаванасці. Малодшыя школьнікі звычайна добра валодаюць механічнай памяццю. Многія з іх на працягу ўсяго навучання ў пачатковай школе механічна завучваюць вучэбныя тэксты, што часцей за ўсё адмоўна адбіваецца на вучобе на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, калі матэрыял становіцца больш складаным і павялічваецца ў аб'ёме. Удасканаленне сэнсавай і адвольнай памяці ў малодшым школьным узросце дае магчымасць засвоіць дастаткова шырокі круг мнеманічных прыёмаў (дзяленне тэксту на часткі, складанне плана і г. д.) [3].

Менавіта ў малодшым школьным узросце развіваецца ўвага. Без сфарміраванасці гэтай псіхічнай функцыі працэс навучання немагчымы. На ўроку настаўнік прыцягвае ўвагу вучняў да вучэбнага матэрыялу, трымае яе доўгі час. Малодшы школьнік можа засяроджана займацца адной справай 10–20 хвілін. У два разы павялічваецца аб'ём увагі, павышаецца яе ўстойлівасць, пераключэнне і размеркаванне.

Адметную ролю ў жыцці малодшага школьніка мае матывацыя. Настаўнік павінен улічваць асаблівасці матываў навучальнай дзейнасці вучняў. Па змесце матывы навучання малодшых школьнікаў можна падзяліць на

1) вучэбна-пазнавальныя, звязаныя са зместам і працэсам навучання;

2) шырокія сацыяльныя, звязаныя з усёй сістэмай жыццёвых адносін школьніка (пачуццё абавязку, самаўдасканаленне, самавызначэнне, прэстыж, дабрабыт, жаданне пазбегнуць непрыемнасцей і г. д.) [2].

Ва ўмовах звычайнага школьнага навучання ў большай колькасці вучняў вучэбна-пазнавальныя матывы знаходзяцца на даволі нізкім



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

узроўні амаль да заканчэння пачатковай школы. У прыватнасці, займальнасць матэрыялу знаходзіцца на першым месцы ў матывацыі. Менш за ўсё ў вучняў развіты інтарэс тэарэтычнага тыпу, творчая актыўнасць. У першым класе вучняў задавальняе выканаўчы ўзровень дзеянняў, а ў трэцім класе гэтага ўжо не назіраецца. Разам з тым назіраюцца адрозненні паміж класамі з розным характарам арганізацыі навучальнага працэсу.

Атрыманыя дадзеныя прымушаюць звярнуць увагу настаўніка на неабходнасць узмацнення ролі пошукавай дзейнасці вучняў, паглыблення ў сутнасць вывучаемых з’яў. Стан матывацыйнай сферы малодшага школьніка характарызуецца такімі ўласцівасцямі, як мера ўсвядомленасці матываў, якія падахвочваюць яго вучыцца, паняцце іх значнасці, мера дзейнасці матыву. Змест гэтых характарыстык і дае ўяўленне аб меры сфарміраванасці таго ці іншага віду матывацыі [2].

У сучасных рэаліях жыцця вялікая ўвага надаецца праблемам развіццёвага і выхаваўчага навучання. Небывалы рост аб’ёму інфармацыі патрабуе ад сучаснага чалавека такіх якасцей, як ініцыятыўнасць, вынаходлівасць, прадпрымальнасць, здольнасць хутка і беспамылкова прымаць рашэнні. Усё гэта немагчыма без умення працаваць творча, самастойна. Калі ў нядаўнім мінулым асноўнай задачай, якая стаяла перад настаўнікам, была перадача вучням пэўнай сумы ведаў, то ў цяперашні час на першы план вылучаецца задача развіцця, выхавання і навучання асобы, якая прыстасавана да паўнацэннага жыцця ў грамадстве і валодае практычнымі ведамі, уменнямі і навыкамі.

Вылучэнне ў працэсе навучання адукацыйных, выхаваўчых і развіццёвых функцый, веданне псіхалагічных асаблівасцей развіцця вучняў забяспечваюць найлепшыя ўмовы засваення ведаў і фарміравання неабходных якасцей асобы. У працэсе засваення ведаў на ўроку фарміруюцца і погляды, і маральныя якасці, развіваюцца здольнасці, гэта значыць назіраецца адзінства і ўзаемасувязь гэтых функцый, аднак кожная функцыя нясе адказнасць за рэалізацыю адпаведных ёй кампанентаў развіцця асобы. Глыбокае разуменне настаўнікам узаемасувязі функцый навучання дазваляе яму творча ставіць і вырашаць адукацыйныя, выхаваўчыя і развіццёвыя задачы ўрока.

## Спіс літаратуры

1. Давыдов, В. В. Психическое развитие в младшем школьном возрасте / В. В. Давыдов // Возрастная и педагогическая психология ; под ред. А. В. Петровского. – Москва : Просвещение, 1979. – С. 69–101.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

2. Талызина, Н. Ф. Педагогическая психология / Н. Ф. Талызина. – Москва : Академия, 1998. – 288 с.

3. Эльконин, Д. Б. Избранные психологические труды / Д. Б. Эльконин. – Москва : Педагогика, 1989. – 560 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова